ВЫСТАВА

# Імгненні азарэння і натхнення

**Павіншаваць Уладзіміра Церабуна з чарговай персанальный выставай у Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей прыйшлі прыхільнікі яго творчасці, сябры, прадстаўнікі мясцовай улады, у тым ліку і старшыня райвыканкама Мечыслаў Гой.**



**На адкрыццё выставы завітала шмат моладзі.**

Цёплыя словы захаплення талентам майстра прагучалі на цырымоніі адкрыцця выставы ад дырэктара гісторыка-краязнаўчага музея Веранікі Забрамскай, начальніка аддзела культуры Таццяны Ражэвай, намесніка старшыні райвыканкама Генадзя Бычко. Родны брат скульптара Юрый Церабун прыгадаў аб падарожжы, якое нядаўна браты здзейснілі па гарадах і весях Наднёманскага краю. На мэце было наведаць тыя мясціны, дзе Уладзімір



**Настаўніца гісторыі СШ №3 Вольга Гакуць дорыць скульптару "самвыдатаўскі" буклет, прысвечаны яго сустрэчам з вучнямі школы.**

Васільевіч пакінуў свой адметны след – свае творы. Багаты і разнастайны матэрыял, відэа- і фотаздымкі ўвойдуць у відэафільм пра здзейсненыя мары творцы. А вось шматлікія задумы і праекты, увасобленыя пакуль што толькі ў мініяцюрах, можна было пабачыць у выставачнай зале. У малой зале знаходзіліся павялічаныя фотаілюстрацыі твораў манументальнага мастацтва, якія ўпрыгожваюць гарадскі пейзаж, інтэр'еры памяшканняў і служаць увасабленнем памяці. Жадаючыя маглі пабачыць творы У. Церабуна і ў буклеце, прысвечаным творчасці майстра, які быў падрыхтаваны і часткова выдадзены да яго юбілею.

Перарэзаўшы зялёную стужку (чаму не чырвоную, варта спытаць у гаспадароў, хоць насамрэч, якая розніца!), Уладзімір Церабун запрасіў прысутных падзівіцца на работы, якія, магчыма, праз нейкі час знойдуць сваё ўвасабленне ў скульптурных кампазіцыях у тым ліку і нашага горада. Ва ўсякім разе, вельмі хацелася б на гэта спадзявацца. Асабліва чакаюць многія смаргонцы знакавага манументальнага фантана "Мядзведжая акадэмія", які стане выдатным упрыгожаннем гарадскога парку.

**Ала СТРАШЫНСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

КОНКУРСЫ